# КНІЖНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ФІЛАСОФСКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАТЭГОРЫЯ БІБЛІЯЛОГІІ: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

**Л.І.Доўнар,** *кандыдат педагагічных навук, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

Развіццё сучаснага грамадства і навукі характарызуецца як разнастайнасцю новых навуковых кірункаў, так і неабходнасцю фарміравання інтэгральных навуковых ведаў [1, с. 33]. У плоскасці двух вызначаных напрамкаў разглядаецца і дадзеная праблема.

Тэрмін “біблііялогія”, які, на думку расійскага бібліятэказнаўцы Ю.М.Сталярова, “в русском языке не приживается” [2, с. 49], тым не менш выступае асноўным для навукі пра кнігу, з’яўляецца тыповым інтэрнацыяналізмам і выкарыстоўваецца ў шэрагу заходніх краін [3, с. 12]. Праблема фарміравання назвы “бібліялогія”, як адзначае польскі вучоны К.Мігань, можа быць часам паказальным індыкатарам яе патэнцыялу, сутнасных змен у ёй, і не толькі семантычных.

У навуковай супольнасці кнігазнаўцаў Беларусі таксама пакуль не назіраецца кардынальных змен, хаця ў апошні час яны ўсё ж наметіліся. Так, у энцыклапедыі “Республика Беларусь” змешчаны артыкул В.Герасімава “Книговедение, библиология” [4, с. 93–94], у якім прыводзяцца два традыцыйныя азначэнні: “1) комплексная общественная наука о книге и книжном деле…”, “2) комплекс родственных, тесно связанных, относительно самостоятельных дисциплин т. наз. книговедческого цикла…”.

Няма адзінай думкі і ў вызначэнні месца бібліялогіі сярод іншых навук: гуманітарных[1], перасячэння гуманітарных і грамадскіх навук [6, с. 25–27]. Ю.М.Сталяроў, зводзячы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства ў адзіную навуковую спецыяльнасць, уключае яе ў навуку аб дакументальных камунікацыях[2], а ў шырокім значэнні – у склад грамадскіх навук.

---

[1] “Bibliologia, zwana też księgoznawstwem – to nauka humanistyczna, której przedmiotem badań jest książka we wszystkich jej aspektach, czyli jako obiekt materialny, nośnik treści a także społeczne narzędzie kultury. Zajmuje się ona zarówno książką dawną jak i współczesną, oraz instytucjami z nią związanymi t.j. wydawnictwa, drukarnie, księgarnie, biblioteki, ośrodki informacji” [5].

[2] Вылучаныя зыходныя элементы “документ” і “потребитель” Ю.М.Сталяроў лічыць аб’яднальнымі для ўсіх трох дысцыплін. Аднак гэты выбар характэрны ў асноўным для сферы распаўсюджвання і захоўвання, а не стварэння дакумента ці кнігі. Кожная з трох навуковых дысцыплін найперш мае справу непасрэдна з дакументам (кнігай), у якім ёсць аўтар і ёсць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучаснае развіццё навуковых дысцыплін так званага кнігазнаўчага цыкла, як можа падацца, усё больш аддаляе іх, прадметна ці праблемна зბліжаючы з іншымі навукамі, аднак міждысцыплінарныя сувязі гістарычна настолькі моцныя і непарыўныя, што прымушаюць зноў і зноў вяртацца да пошуку інтэгральнай навукі, якая раскрыла б значнасць “кніжных ведаў” у развіцці чалавечага грамадства. Інтэрпрэтуючы Ф.Ніцшэ, калі мы будзем ведаць, “навошта” мы гэта робім, то абавязкова вытрымаем любое “як”.

Адным з адказаў на гэтае пытанне, на наш погляд, будзе ў першую чаргу вызначэнне бібліялогіі як сістэмы навук пра кнігу, якая мае як тэарэтычны, так і прыкладны ўзроўні. Аб’ект бібліялогіі – кніга (у шырокім значэнні) мае універсальны характар і з’яўляецца прадуктам і сродкам развіцця культуры–цывілізацыі[3]. Прадмет бібліялогіі мае гетэрагенны характар, звязаны са сферай дзейнасці чалавека, якая выкарыстоўвае кнігу, і ў залежнасці ад яго (прадмета) вызначэння бібліялогія можа прымяняць шырокі метадалагічны спектр гуманітарных і грамадскіх навук, у выніку чаго адпаведна фарміруюцца адносна самастойныя навуковыя кірункі. Гэта, аднак, не размывае прадмет, а робіць яго разнастайным, дзякуючы чаму і выяўляецца фенаменалагічная роля кнігі ў развіцці чалавецтва.

Такім чынам, аб’ект і прадмет бібліялогіі, непарыўна звязаныя з галіной культуры – цывілізацыі, прадвызначаюць выкарыстанне метадалогіі навук, якія займаюцца адпаведнымі галінамі, і гэта ў першую чаргу філасофія (філасофія культуры) і культуралогія. Адзін з навуковых кірункаў, які адлюстроўвае функцыянаванне кнігі ў культуры, – кніжная культура. Як адзначае расійскі вучоны У.І.Васільеў, самастойным навуковым кірункам (дысцыплінай кнігазнаўчага характару) ужо прызнана гісторыя кніжнай культуры [7, с. 86].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

інфармацыя. Ужо першапачаткова дакумент (кніга) выступае як сацыяльная інфармацыя, якая мае свой камунікацыйны канал. А адно з азначэнняў культуры – тое, што яна з’яўляецца сацыяльнай інфармацыяй, перадаваемай па сацыяльных каналах [цыт. па: 1, с. 19]. Прапанова Ю.М.Сталярова выяўляць на аснове анталагічнай (інфармацыйнай) функцыі фенаменалагічныя ролі дакументакамунікацыйных сістэм таксама ўказвае на выкарыстанне культуралагічнага падыходу ў дадзенай сферы [2, с. 176].

[3] Культура и цивилизация образуют двухчастную систему (бисистему). […] Культура есть информационная, знаково-символическая, ментальная, духовная основа цивилизации. В свою очередь цивилизация подводит под культуру технико-технологический базис, систему материального и жизненного обеспечения, институционально оформляет и поддерживает ее [цыт. па: 1, с. 37–38].

У беларускім кнігазнаўстве ўпершыню задача вывучэння кніжнай культуры з пазіцый культуралагічнага падыходу была пастаўлена М.В.Нікалаевым [8]. Абгрунтаванне такога падыходу з пазіцый філасофіі культуры можна знайсці і ў аксіялагічнай канцэпцыі культуры беларускага філосафа і культуролага М.І.Крукоўскага [9], які вызначае культуру як сістэмную сукупнасць духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, прадстаўленую іерархічнай структурай, дзе асноўнымі ўзроўнямі з'яўляюцца духоўная, мастацкая і матэрыяльная культуры [10, с. 102–104]. Кніга ў культуры разглядаецца, з аднаго боку, як артэфакт і аснова быцця культуры, а з другога – як навуковая катэгорыя кніжнай культуры ў складзе адпаведнай навуковай дысцыпліны. Кніжная культура вывучае кнігу ў кантэксце сацыякультурнай прасторы, дзе культура і цывілізацыя разумеюцца як цэласнае і ў той жа час рухомае адзінства духоўнага, мастацкага і матэрыяльнага яе пластоў.




У сувязі з тым, што сёння дынамічная раўнавага паміж культурай і цывілізацыяй у грамадстве "масавага спажывання" парушана (аб чым сведчыць і сучасны фінансава-эканамічны крызіс), значна актуалізаваўся пошук шляхоў выжывання і змянення сітуацыі як у глабальным, так і нацыянальным маштабе. Галоўным з іх якраз і можа быць шлях пераасэнсавання, пераарыентацыі прыярытэтаў у бок культуры, якая забяспечвае духоўную і інтэлектуальную бяспеку развіцця цывілізацыі. Культура павінна стаць мэтай, а цывілізацыя – сродкам, а не наадварот.

Адсюль і важнейшае значэнне, якое набывае даследаванне кніжнай культуры ў кантэксце філасофска-культуралагічнага падыходу (метадалогіі), і адказ на пытанне "навошта?". Кніжная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культура як галоўная катэгорыя бібліялогіі дае магчымасць выхаду на інтэгральныя веды, у першую чаргу гэта шанс для “дысцыплін кнігазнаўчага цыкла” – набыць аб’яднальную назву, не робячы замаху на самастойнасць кожнай з іх, а важней за ўсё – сэнс гэтай інтэграцыі – гуманізацыя ведаў, грамадства.


1. *Ширшов, И.Е.* Теория и история культуры / И.Е.Ширшов, В.В.Качановский. – Мн.: Бел. гос. эконом. ун-т, 2002.

2. *Столяров, Ю.Н.* Библиотековедение, библиография и книговедение как единая научная специальность: полный курс лекций для аспирантов и соискателей / Ю.Н.Столяров // Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – Орёл, 2007.

3. *Мігань, К.* Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / К.Мігань; пер. з польск. Л.Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; склад. Л.І.Доўнар, Т.А.Самайлюк, Т.А.Дзем’яновіч; рэдкал.: Б.У.Святлоў [і інш.]. – Мн., 2008. – Вып. 2.

4. *Герасимов, В.Н.* Книговедение, библиология / В.Н.Герасимов // Республика Беларусь: энциклопедия: в 7 т. – Мн.: БелЭн, 2007. – Т. 4.

5. *Bibliologia* [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: htt://pl.wikipedia.org/wiki/.

6. *Antczak, M.* Metoda bibliograficzna, statystyczna i porównawcza w badaniach bibliologicznych na przykładzie badań własnych / M.Antczak // Bibliologia. Problemy badawcze nauk humanistycznych: praca zbiorowa / Stowarzyszenie Bibliotekarzy Polskich; pod. red. D. Kuźminy. – Warszawa: Wydawnictwo SBP, 2007.

7. *Васильев, В.И.* История книжной культуры. Теоретико-методологические аспекты / В.И.Васильев. – М.: Наука, 2004.

8. *Нікалаеў, М. В.* Пачаткі кніжнай культуры Вялікага княства Літоўскага / М.В.Нікалаеў // Спадчына. – 2002. – № 5/6 (150).

9. *Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію / М.І.Крукоўскі. – Мн.: Універсітэцкае, 2000.

10. *Самойлюк, Т. А.* Белорусская книга в контексте мировой книжной культуры / Т. А.Самойлюк // Книжное дело. – 2006. – № 2.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ